Брэменскае рэгіянальнае аб’яднаньне Нямецкай асацыяцыі журналістаў (DJV) абвяшчае ў 2023 годзе першы конкурс на стыпэндыю імя Мары Міндэрман у памеры 5000 эўра. Першапачаткова яна распрацаваная як стыпэндыя для рэалізацыі праектаў на пэрыяд 12 месяцаў. Стыпэндыя імя Мары Міндэрман DJV Брэмен скіравана на падтрыманьне прафэсыйных альбо былых прафэсыйных журналістаў і журналістак, якія былі змушаныя пакінуць сваю краіну. Рэгіянальнае аб’яднаньне DJV у Брэмене хоча даць журналіст(к)ам, якія жывуць у эміграцыі, магчымасьць самастойна рэалізаваць журналісцкі праект на свой выбар.

Стыпэндыя адкрытая для калегаў любога гендэрнага самавызначэньня. У першую чаргу стыпэндыя адрасаваная журналіст(к)ам і публіцыст(к)ам з Цэнтральнай і Ўсходняй Эўропы, а таксама ўцекач(к)ам з краінаў, у якіх адсутнічае свабода прэсы. Падставай зьяўляецца штогадовая справаздача ’’Рэпартэраў бязь межаў’’ за 2022 год. Асаблівая перавага будзе аддавацца выпадкам перасьледу па гендэрнай прыкмеце.

Зацікаўленыя калегі могуць падаваць заяўкі з 15 верасьня да 31 кастрычніка 2023 года. Пераможца будзе абвешчаны(а) 9 сьнежня, у дзень нараджэньня Мары Міндзерман.

Каб падаць заяўку неабходна даслаць:
- тэму сваёй працы,
- экспазыцыю (адна старонка фармату A4, максымум 3500 знакаў), пажадана на ангельскай мове,
- рэзюмэ.

Дакумэнты прымаюцца толькі ў фармаце PDF па электроннай пошце info@djv-bremen.de

Рашэньне пра прысуджэньне праектнай стыпендыі выносіць незалежнае журы шляхам адбору. Аспрэчыць вынікі праз суд немагчыма.

Узнагародны фонд будзе выплачвацца дванаццацьцю штомесячнымі траншамі (11 x 400 эўра, 1 x 600 эўра).

Падчас рэалізацыі праекту пераможца будзе карыстацца падтрымкай ад DJV Брэмен. Вынікі працы будуць прэзэнтаваныя на публічнай імпрэзе ў сьнежні 2024 года.

Калі вы маеце дадатковыя пытаньні, калі ласка, зьвяжыцеся з офісам DJV у Брэмене: info@djv-bremen.de